Цана аддзельн га нумару у розьнічнай прадэжы 3 кап.

Пролетары усіх краеу, злучайцеся!

ГАЗЭТА СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ

МАЛАДЫ АРАТЫ

Падпісвайся на МАЛАДЫ АРАТЫ!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
У месяц 12 кап.
ПАДПІСНУЮ ПЛАТУ адрауляць па адрасу:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63, Беларускае ДЗЯРЖ. ВЫДАВЕЦТВА.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, Комсамольская 25—тэл. 294.

№ 2(98) Орган Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ. Субота 31 студзеня 1925 г. № 2(98)

Сялянская моладзь Беларусі вітае, 5 ленінцаў—рабочых, ідучых на падмогу весцы.



Мобілізацыя 45 у веску.

У гэтыя дні, калі пролетарыят усяго сьвету праверае наколькі ім выкананы ... вялікага правадыра і ... чыцеля—як мы ідземшлям ... м Ленінізму бяз Ільліча.

Наш Ленінскі комсамол ... ларусі закончыў кампа... , на першы погляд ня... льмі вялікаю, але якая ... лужыць бязумоўна глы... йшым замацаваньнем су... зі гораду з вёскай, яшчэ ... льш замацуе мост між ... тыяй рабочай клясай і ... лянствам.

45 лепшых комсамоль... — партыйцаў, актыві... ў фабрыкаў, заводаў і ... унак узяты горадам і ... аны вёсцы.

Хто мобілізаваны.

Ніжэй адзначаныя ліч... характызуюць склад мо... заваных.

— Усе рабочыя з чы... к, мэталістаў, дрэва... цоўнікаў папернай пра... ловасьці.

... сяброў і 30 кандыда... партыі, усе актывісты ... ычна адукаваны як ... 6—сяброў акружко... 16—сяброў Райкомаў, ... —кандыдат ЦК.

... се таварышы актыўна ... аўшыя ўдзел у гра... кай працы ў горадзе, ... ы горсавету фабзаўко... у комісіях коопэрацыі.

... аданьні прад імі стаяць ... адачы стоячыя прад ... ізаванымі адпаведныя ... чныя.

... трэба вывучыць быт ... авіны вёскі, ульліцца ў ... жыцьцё і на паставе ... ланага распачаць пра... шырэньня новага бы... алепшыць дзейнасьць ... цкіх установ.

... рыцягнуць на свой ... бедняка і серадняка, ... ваць аўтарытэт сялян... моладзі і грамад пра...

Акрамя гэтых агульных заданьняў на мобілізаваных першачарговым заданьнем ускладаецца падняць працу ячэйкі, узмацніць Ленінскае выхаваньне вясковага комсамольца.

Актывізаваць усю масу комсамольцаў свае ячэйкі, свайго раёну.

Трэба памятаць, што нядзеля кіраўніцтва ў вёсцы яны прызваны, а дзеля працы, дзеля выхаваньня вёскі.

Высоўваньне гарадзскіх хлопцаў дзеля працы ў весцы ня ёсьць перашкодай выдзьвіжэньня вясковага актыву, а наадварот: чым ляпей будзе весьціся Ленінскае выхаваньне тым мацней будзе высоўвацца актыў з бедняцкай часткі вясковай ячэйкі.

Не малая праца чакая выдзеляных таварышоў.

Памятайце таварышы, што ўвесь Ленінскі Комсамол Беларусі з асаблівай увагай сочыць за вашай працай, у патрэбнаю хвіліну і Комсамол і партыя прыдуць вам на падмогу.

Наша гарачае прывітаньне рабочым комсамольцам фабрык і заводаў якім мазольнымі рукамі належыць выканаць адну з найвялікшых працаў нашага саюзу—працу ў вёсцы.

Д. Ешчын.



Політычная выхаваньне комсамольцаў.

Цалком даносавацца да умоў вёскі паставіць палітычнаю вучобу у вёсцы на патрэбны узровень мы яшчэ непасьпелі. Гэтаму шмат перашкодаў. Няма партыйнаў кіраўнікаў гуртк ў. Кіруючыя палітгурткамі комсамольцы ня маюць патрэбнага разьвіцьця. Палітграмота для вёскі Ярослаўскага няўсім зразумела.

Як ідзець праца.

А ўсёж такі нашы ячэйкі ня сьпяць. Пры ўсіх ячэйках працуюць паліткіраўнікі, у некаторых ячэйках, праўда няваўсіх, організованы і працуюць групы чытаньня дзеля больш разьвітых комсамольцаў — комсамольскага актыву.

Увага пытаньням усваеньня.

Цяжкая кніжка палітграматы Ярослаўскага, а лепшай няма, ды і меняць сярод году, няма ніякога рахунку. Гэта значыць надарваць вучобу.

Трэба прыстасавацца да кожнай гутаркі якая прарабляецца, дзеля таго каб лягчэй было разабрацца і паўтарыць пройдзенае, Акружкамолы павінны раз працоўваць праграму пытаньняў. Інструктары акружкамолу, прадстаўнікі райкомаў прыязджаючы ў ячэйку павінны пагутарыць з сябрамі палітгуртка, дапамагчы разабрацца у цяжкіх пытаньнях, паўтарыць с рэбятамі усё пройдзенае.

Палепшым кіруючы склад поўсправы зробляна.

Дрэнныя кіраўнікі паліткружкоў шмат у якіх ячэйках, свае комсамольцы партыйцы, а то бывае, што зусім безпартыйныя кіруюць нашымі палітгурткамі. Вось дзеля прыкладу у вёсцы студзенцы Магілеўскай акрузе, палітгуртком ЛКСМ кіруе скончыўшая 2-ю ступень безпартыйная вучаніца.

Райкомам трэба прагледзіць склад кіраўнікоў паліт гурткоў.

Кіраўніком павінен быць лепшы комсамолец — партыяў. Безпартыйных браць на гэту працу ніяк ня трэба. На бліжэйшых занятках райпромколектываў, трэба добра, асноўна пагутарыць аб працы палітгурткаў, акрамя гэтага няшкодзіць пару раз ў асобна склікаць сход кіраўнікоў, каб разам намеціць шляхі далейшай працы

Памятаць пра адзіночак.

Расьцець комсамольская вёска, за 5—7 вёрстаў прыходзяць хлопцы і дзяўчаты „запісвацца" ў ячэйку пры цэнтры сельсавету.

Як сьнаговы ком—абрастаюць нашы вясковыя ячэйкі такімі адзіночкамі. Ня кожны раз можна хадзіць адзіночку у ячэйку на ўсе заняткі. Трэба да яго прыстасавацца.

І грамады адзіночак, жывучых недалёка адзін ад другога, організуюць асобны паліт-гурток.

У гэтакі паліт-кружок даецца кніжка Ярaслаўськага, уцягваюцца безпартыйныя і начынаецца вучоба.

Як Ленін загадываў працаваць на вёсцы.

Наш комсамол Ленінскі. Наша жаданьне быць ва ўсім такім, як быў Ленін, рабіць так як ён загадываў.

Дзеля гэтага трэба ў сваёй штодзённай працы праверыць сябе, ці раблю я так, як казаў гэта рабіць Ленін.

На вёсцы мы маем беднату, серадняка і кулака. Бедната за нас. Гэта наш друг. Кулак наш вораг. Ён проціў нас. Серадняк жа хістаецца. Ён будзе за нас, калі бачыць, што мы яму паказываем правіловы шлях, калі ён бачыць што мы яму дапамагаем узьняць сваю гаспадарку. Трэба працаваць так каб заўсёды выйграў бедняк і серадняк. Якжа працаваць сярод іх?

„Ня сьмець камандаваць" *) кажа Ленін. Гэтыя яго словы нашым комсамольскім ячэйкам на вёсцы трэба заўсёды помніць. Ня можна выступаць і працаваць сярод сялянства як камандзіры й настаўнікі. Праз таварыскі падход, праз таварыскае тлумачэньне, можна дасягнуць тое, што не дасягнуць соткі другіх людзей, якія вялі сябе як камандзіры і начальнікі.

„Селяніну патрэбна прамысловасьць гораду без яе ён ня можа жыць, а яна у нашых руках. Калі мы за справу возьмемся правілова, тады селянін будзе дзякаваць нам за тое, што мы панясём яму з гораду гэтыя продукты, гэтыя прылады, гэтую культуру. Іх панясуць яму не эксплёататары, не паны, а такія самыя таварышы — працоўнікі, якіх ён цэніць вельмі глыбака Але цэніць практычна, цэніць іх фактычную дапамогу, адхіляя і зусім справядліва адхіляя камачдаваньня, „прэдпісаньня" зьверху. Ня усе яшчэ комсамольцы зразумелі гэта. Шмат яшчэ, каторыя з нас больш любяць загад камандзіра, чым параду таварыша. «Не па кніжнаму а на зразумелай мужыку мове», трэба даваць гэту параду. Раней дакажыце, а пасьля дабівайцеся даверра. Калі правілова будзе весьціся гэта справа, калі правілова будзе пастаўлены кожны крок нашае групы ў павеце ў воласьці .. Калі кожны будзе уважліва праверан з гэтага пункту гледжаньня мы заваюем даверра селяніна і толькі тады мы можам ісьці далей... Гэта ня будзе загад камандзіра, а парады таварыша. Селянін будзе тады ў поўнай меры за нас".

Так гаварыў Ленін аб працы на вёсцы яшчэ у 1919 годзе. У гэтай жа прамове ён гаварыць аб тым як пазнаць серадняка. Гэтая пытаньня шмат хто з комсамольцаў задае на сходах і конфэрэнцыях.

Ленін прыводзіць такі выпадак. Аднаго таварыша абступілі сяляне і кожны пытаўся: Зазнач, серадняк я ці не?. Маю два кані і адну карову. Маю дзьве каровы і аднаго каня і г. д. І вось гэтаму агітатару трэба мець такі безпамылковы тэрмометр, каб яго можна было паставіць селяніну і сказаць серадняк ён ці не. Дзеля гэтага трэба ведаць усю гісторыю гаспадаркі гэтага селяніна, адносіны яго да ніжэйшых і вышэйшых группаў, а ведаць гэта пунктуальна мы ня можам".

Трэба ведаць, кажа Ленін, адносіны яго да ніжэйшых і вышэйшых груп, да беднаты і кулака, трэба ведаць куды цягне той ці іншы селянін, да каго у яго больш прыхільнасьці.

А. Самахвалаў.

*) Выняткі зроблены з прамовы Леніна на VIII зьезьдзе РКП у 1919 г.

Цяжэй заносавацца, калі адзіночка жывучы далёка ад ячэйкі нямае блізкіх суседзяў—комсамольцаў, такому парню трэба асобна даць кніжку політасьветы, дапаручаць яму прачытаць поўглавы, главу, а пасьля праверыць як прачытана як разумела. Сэкратар ячэйкі, кіраўнік палітгуртка павінны уважліва кіраваць паліт-вучобай адзіночак.

Дапасавацца да навічкаў.

Расьцець ячэйка комсамолу. Усё новыя і новыя рэбяты уваходзяць у яе склад. Трэба з іх уцягнуць у палітвучобу. Першая справа — пабольш безпартыйных у комсамольскія політ гурткі. Хлапец увайшоўшы ў наш гурток — гэта будучы комсамолец, уцягваючы беспартыйную моладзь у політ-гурткі, мы часткай вырашаем пытаньне аб абслугоўваньні навічкаў. Гэтым, вядома, не абмяжуешся. Бывае, што ячэйкай пройдзены 3—4 гутаркі, а новыя парні уваходзяць. На ша справа уключыць у гурток—кожнага і асобна з імі займацца, каб яны ўсвоілі усё тое, што раней пройдзена гуртком. Найбольш сьвядомыя, разьвітыя сябры гуртка павінна стаць вучыцелямі па палітпадрыхтоўцы навічкоў.

Сьмялей ствараць групы чытаньня.

Амаль ваўсіх ячэйках маецца 3—5 і болей разьвітых комсамольцаў. Мала для іх тых ведаў, якія даюцца ў паліт-гуртку. Яшчэ з пачатку зімы вырашана было організаваць для такіх комсамольцаў групы чытаньня. У некаторых месцах такія групы маюцца, займаюцца вывучэньнем гісторыі партыі, чытаюць газэту „Правда" добра пасьпеваюць. Трэба каб сёгка гэтых групаў чытаньня разгарнулася шырэй. Ячэйка, якая мае у сваім складзе рэбятаў якія маюць веды вышэй політ-гуртка павінна мець «групу чытаньня».

Больш увагі політасьвеце.

Нашумелі мы ў пачатку зімы. Уся увага політ вучобе, паглядзіш дык гэтай увагі вельмі мала. Розныя пасяджэньні, парады, заўжды зрываюць працу політ-гурткоў. Меньш сходаў, ды пасяджэньняў, а больш занятках у політ-гуртках. Не адзін раз а 2 разы ў тыдзень трэба займацца політгуртком ні у якім разе нязрываць іх працы. Сьмялей тварыць «групы чытаньня» палепшыць склад кіраўнікоў.

Вось якой увагі трэба вясковай Політ-вучоба. Л. ЦЭЙТЛІН

Савецка-японскі дагавор.

ТОКІЕ. 20-га студзеня а 24 гадзіне была падпісанасавецка-японская згода.

Тав. Чычэрын пра значэньне савецка-японскага дагавору.

МАСКВА. У размове з корэспондэнтамі прэсы аб утварэньні савецка японскага дагавору. т. Чычэрын між іншым сказаў.

«Падпісаная 20-га студзеня ў Пекіне савецка-японская згода зьяўляецца ня толькі першым пунктам пэрыоду прыяцельскіх адносін між народамі СССР і Японіі—гэта сапраўдны пералом ўсёй дальня-ўсходняе політыкі і сучаснае політыкі наагул. Гэта ёсьць бязумоўнае ўзмацненьне нашага становішча на Дальнім Усходзе. Дзеля Японіі-ж гэты дагавор азначае стварэньне прыяцельскага тылу на выпадак асклажненьняў, якія могуць ёй пагражаць. Дагавор з Японіяй зьяўляецца ажыцьцяўленьнем аднаго з пастаянных імкненьняў народаў СССР.

Надзвычайна гарачае прыяцельскае спатканьне, якое было наладжана першаму ўзышоўшаму на тэрыторыю Японіі прадстаўніку СССР Іоффе выразна паказала, наколькі японскі народ у сваіх шырачэйшых масах зразумеў неабходнасьць дружбы з СССР. У занятым японскім урадам палажэньні у адносінах да нас заметна глыбокая перамена. Увесь апошні пэрыод перамаўленьні і іх атмосфэра была ўжо далёка ня тою, як на ранейшых конфэрэнцыях.

Падпісана 20-га студзеня згода ёсьць першы крок. Яго насьледкі адзначацца вельмі глыбока на ўсім комплексе ўзаемных адносін.

МАСКВА. Апублікован тэкст савецка-японскага дагавору. Згодна дагавору, між СССР і Японіяй наладжваюцца нармальныя дыплёматычныя адносіны. Пытаньні аб узаемных абавязацельствах павінны быць умяркованы ў далейшым. Японскі ўрад абяцае вывесьці свае войска з паўночнага Сахаліну, дзе ўтвараецца савецкі лад. Асобым пратаколам рэгулюецца пытаньне аб будучых японскіх концэсіях на Сахаліне, згодна якога СССР згаджаецца даць Японіі концэсію ў 50 процантаў пляцу нафтавых крыніц усходняга ўзьбярэжжа Сахаліну, апроч таго права эксплёатацыі вугольных капальняў.

Японія абавязуецца выплачваць ад 5 да 8 процантаў валавога здабытку вугля і 5—15 проц. валавога здабытку нафты.

Японскія партыі вітаюць савецка-японскі дагавор.

ТОКІЕ. Агалошана паведамленьне японскага міністра замежных спраў Шыдэхара аб падпісаньні японска-савецкага дагавору. У паведамленьні выказваецца пачуцьцё шчырага здавальненьня. Ураўвыя партыі Кэнсэкай, Сей Юкай і Кокушын пастанавілі ўвесьці ў парлямант рэзолюцыі, вітаючую падпісаньне дагавору. Усе газэты амаль цалком прысьвечаны савецка-японскай згодзе. Корэспондэнт Роста атрымлівае шмат павіншаваньняў.

Водгукі на савецка-японскую згоду ў Амэрацы.

НЬЮ-ЕРК. Агэнцтва «Юнайтэд Прэс» разаслала тэлеграму свайго карэспандэнта з Вашынгтону, у якой гаворыцца, што савецка японская згода павінна зрабіць больш хуткім прызнаньне СССР Злучанымі Штатамі, бо яны пакуль што асталіся з вялікіх дзяржаваў адною, якая яшчэ ня прызнала СССР. На пазыцыю Злучаных Штатаў—кажа тэлеграма—робяць уплыў такія абставіны: разуменьне ўстойчывасьці савецкага ўраду, політычныя і эконамічныя нявыгоды, асабліва на ўсходзе, якія выплываюць з ізаліраванага палажэньня Злучаных Штатаў, націск з боку дзелавых людзей Амэрыкі, якія ужо з посьпехам праводзяць справы з Савецкім Саюзам і перамена ў настроі грамадзкае думкі, якая не супярэчыць больш проці прызнаньня.

ВЕНА. Аўстрыйская, вэнгэрская і чэхаславацкая прэсы прыдаюць вялікае значэньне савецка-японскаму дагавору і малююць пэрспэктывы супрацоўніцтва СССР з Японіяй і Кітаем. Прэса ацэньвае дагавор, як самы значны замежна-політычны посьпех СССР за апошнія гады і зазначае, што СССР, дзякуючы гэтаму дагавору, вярнуў старыя пазіцыі Расеі на Дальнім Усходзе.

Румынія ў трывозе.

У румынскіх політычных колах падпісаньне савецка-японскае згоды выклікала вялікае нездавальненьне. Румынская капіталістычная прэса зазначае, што з прызнаньнем СССР Японіяй Румынія апошняя надзея Румыніі на ратыфікацыю Японіяй бесарабскага пратаколу.

Новы урад у Нямеччыне.

У Нямеччыне ўтварыўся новы ўрад. У склад гэтага ўраду ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх буржуазных партыяў.

Галава новага ўрада—былы міністар грашовых спраў Лютэр выступіў у нямецкай дзяржаўнай думе з заяваю аб тым, якую політыку будзе правадзіць новы ўрад.

У сваёй прамове Лютэр заявіў, што новы ўрад пастараецца выпаўніць згоду, утвораную між Нямеччынай і краінамі—пабядзіцельніцамі, аб новым парадку ўплаты Нямеччынай ваеннай дані. Разам з гэтым новы ўрад будзе дамагацца таго, каб гэтую дань зьняць з тых мясцоў, якія заняты цяпер войскам гэтых краін—пабядзіцельніц (напр. Францыяй).

Гаворачы аб унутраных справах, Лютэр абяцаў прыняць над увагу інтарэсы працоўнага народу. Аднак што тут будзе рабіць новы ўрад, аб гэтым Лютэр нічога не сказаў,

Гэтыя ліцамерныя заявы Лютэра вызвалі з боку нямецкіх комуністаў розныя насьмешлівыя словы, асабліва калі Лютэр заявіў, што гэты новы ўрад нібы-то не зьяўляецца ўрадам буржуазных партыяў, а беспартыйным урадам.

Што гаварылася ў спрэчках?

Спрэчкі па гэтай заяве Лютэра пачаў правадыр соцыял-дэмократычнай партыі (меншавіцкай) партыі. Нават і ён у сваёй прамове мусіў сказаць, што новы ўрад Нямеччыны мае намеры падрыхтаваць у Нямеччыне зноў царскі строй.

Прадстаўнік ад Нямецкай Комуністычнай партыі заявіў, што новы ўрад не дасьць нічога добрага працоўным Нямеччыны і за гэтым Комуністычная партыя будзе весьці з ім барацьбу.

Ленінскі тыдзень.

Лёзунгі Амэрыканскага комсомолу.

Амэрыканскі комсамол «тыдзень Леніна і Лібкнехта» праводзіў пад лёзунгі: «Организуйце фабрычна-завоцкія ячэйкі». «Пашырайце вучэньне Леніна». «Зрабіце дзень гадавіны сьмерці Леніна гісторычным днём бальшывізацыі Амэрыканскага комсамолу».

Перадача германскіх комсамольцаў у партыю.

«Ленінскі тыдзень» у Нямеччыне прайшоў пад галоўным лёзунгам:

«Узмацненьне саюзу і узмацненьне кампаніі прыёму новых сяброў».

Выдаваліся спэцыяльныя нумары заводзкіх газэтаў.

У кожнай ячэйцы праводзіліся сходы, акрамя гэтага, на некаторых ячэйках, праводзіліся вечары і сходы сумесн[о] з партыяй

У панядзелак 19 студзе[ня] ва ўсіх буйных гарадох адбы[лі]ся дэмонстрацыі

Зварачваецца ўвага на ў[з]мацненьне працы ў прафсаю[]зах.

Комфракцыі саюзаў ладзя[ць] сходы ў сэкцыях моладзі [на] якіх чытаюць даклады аб з[на]эньні Леніна, Лібкнехта [і] Розы-Люксембург.

Комсамольцы якія маю[ць] больш 20—год передаюц[ца] дзеля працы ў партыю, [] адначасова яны ня супыняю[ць] працы і ў Саюзе.

Для такіх тав. рыхтуюц[ца] спэцыяльныя сходы з дак[ла]дамі «Задачы Компартыі Н[я]меччыны».

„Як павінны працаваць партыі сябры комуністычна[га] саюзу моладзі».

Александров[іч]

„Па Беларускім бруку".

Новую літаратуру павінна стварыць моладзь, гэтая новая літаратура бяз журботы, бяз сьлёз, поўна жыцьця, нявычэрпнай волі.

Комсамол мае шмат здольных бадзёрых комсамольцаў. Адных дала Беларуская вёска, другіх сутарэньне гораду.

На працягу ўсяго жыцьця Беларусі нібыло ніводнага поэты, які-б успрыняўшы про стэрскую сучаснасьць—рабочы горад моцнымі радкамі з бразаў адчыніў прад усімі жыцьцё Беларускага гораду (маю агаварыцца: да прадстаўнікоў поэтаў гораду належыць Цішка Гартны, але яго творчасьць адносіцца да часоў пана ваньня капіталізму і эксплёатацыі рабочых у Беларусі) Андрэй Александровіч—адзін з палага шэрагу поэтаў даў тое, чаго сотні годоў чакала Беларусь. Настроі сучаснай, рабочай моладзі адчуваюцца ў першых радкох яго вершаў.

Цягаюцца яшчэ у горадзе прыкрыя, агідныя псы напмачоў Александровіч занатоўвае настроі гэтых трутнёў і словамі задору зварочваецца да іх:

> Тым кажу,
> Каму наша песьня чужая;
> Праводжу мажу,
> Пачынаю.

Ен ведае, што пан-нэпман ня любіць працы, а яшчэ гор[ш] фабрыкі:

> Прыкры табе гэты дым
> Точыць сэрца тваё як тум[ан]

У радкох сваіх вершаў А[лек]сандровіч гаворыць хто яны [та]кія, што вялюбяць рабочага, [г]

> «Такія, што у бляску золат[а]
> Галава як і грудзі наўсьця[ж]
> І прыкра ім, што сьпеў мо[й]
> Беларусі Савецкай наш».

Як перажыўшы рэволюцыя, прыяўшы яе А. А. ведае, [] станецца з рэштай ворагаў:

> — «Дым гэтых кашых фа[брык]
> Праглые далікатныя вочы»

Узаемныя адносіны гора[ду] вёскай—змычка рабочых і с[ялян] знаходзіць належны адбітак.

Часы акупацыяў і жыцьцё людзей гораду: рабочых, мяш[чан] паноў,—захапляюць сваёй мас[]кай вобразнасьцю і выяўл[я]. А. Александровіча як здол[ьнага] поэту мастака, першага песь[няра] Беларускіх фабрыкаў, завод[аў] сутарэньняў.

Кожны вясковы хлопец, [ком]самолец павінен прачытаць [«Па] Беларускім бруку» адкуль м[ожа] шмат скарыстаць матар'ялаў[,] уяўляць сабе жыцьцё гораду, [сён]ньнешняга гораду які ў с[] сутарэньнях выхаваў здоль[нага] комсамольца, першага мас[така] поэту - прадстаўніка Белару[скіх] рабочых.

Ул. []

Заветы Леніна і Комсамольцы вёскі.

(Артыкул тав. Зіноўева).

Усе жыцьцё сваё аддаў Ленін справе працоўных.

Рабочая кляса й працоўнае сялянства ўсяго сьвету прызнала тав. Леніна за свайго лепшага настаўніка. І год таму назад, у дзень пахаваньня Ільліча, дзесяткі мілёнаў працоўных усёй зямлі схілілі головы. 21 студзеня 1925 году, у першую гадзіну яго сьмерці, каля вялікай магілы Леніна ў Маскве зноў зьбяруцца думкамі міліёны працоўных усяго сьвету—усё што ёсьць чэснага, лепшага ў рабочай клясе й сярод працоўнага сялянства ўсёй зямлі.

Адным з важнейшых заветаў Леніна зьяўляецца Саюз рабочых і сялян.

І тая частка вучэньня Леніна, у якой гаварыцца аб гэтым саюзе, для працоўных самая дарагая. Рабочая кляса ня можа канчаткова ўзяць перамогу над буржуазіяй бездапамогі сялянства. Таксама й сялянства ня можа стаць самастойнай сілай і скінуць з сваіх плеч прыгнечаньня памешчыкаў, без дапамогі рабочых. Як мага замацаваць і берагчы змычку пажіж рабочымі й сялянамі—вось дарагі завет Ільліча

Сялянская моладзь—вялікая сіла.

Сялянская моладзь, вырасшая за рэволюцыйныя годы, ёсьць галоўная нашая надзея. У сэрцы маладога пакаленьня сялянства менш рэлігійных забабонаў і інш, яно больш граматнае, энэргічнае, у яго большае імкненьне да новага жыцьця.

Комсамольцы вёскі павінны зрабіцца жывым мастом паміж сялянствам і рабочай клясай.

Завет Леніна — усім стаць сьветлымі і шчасьлівымі.

Паміраючы думаў Ленін і нам завяшчаў думаць аб тым, што нашу савецкую краіну, дзе яшчэ так шмат няграмотных, дзе яшчэ так многа беднасьці, дзе яшчэ так шмат старога дарэволюцыйнага, дзе яшчэ існуюць, багацтва й беднанасьць, селянін часта жыве ў цяжкіх умовах, трэба ператтварыць у краіну, бяз ніводнага няграматнага, культурную, багатую, бязбеднасьці, бяз веры ў рэлігійны дурман, бяз неравенства; перетварыць у краіну, якая паднялаб сваю гаспадарку на нябывалую вышыню,—у краіну Соцыялістычную. Дзеля дасягненьня гэтага павінны працаваць усе, але большая й важнейшая доля працы прыпадае на сялянскую моладзь, на тую моладзь, якою хоча кіраваць комсамол.

Вясковыя комсамольцы, гэта—пакуль што першыя ластаўкі, але гэтыя ластоўкі, якія зробяць вясну.

Вясковыя комсамольцы, калі яны хочуць выпаўніць заветы Ільліча, павінны змагчы наперад за ўсё ўвайсьці ў гаспадарчае жыцьцё і быт вёскі.

Комсамольцы вёскі павінны весьці сябе так, каб уся вёска сказала: Комсамолец гэта—самы лепшы, самы чэсны, самы бескарысны, гатовы на самаахвару, самы граматны, талковы.

Комсамолец павінен умець ня толькі чытаць газэту й кніжку і ўстрайваць дэмонстрацыі 1-мая і 7 лістапада, а павінен быць першым, калі справа йдзе аб тым, каб направіць мост, дарогу, адрамантаваць грамадзкае памяшканьне, каб дапамагчы селяніну-пагарэльцу, бедняку, падрымаць сям'ю чырвонаармейца, дапамагчы наладзіць кооператыў, або з весьці на чыстую воду хабарніка, ці паправіць школу, прывезьці для яе дроў, або электрафікаваць вёску і г. д. Комсамолец павінен быць першым барацьбітом супроць п'янства, першым працаўніком па ліквідацыі няграматнасьці, першым у організацыі сельска-гаспадарчых гуртков і наагул першым памоцнікам савец ай улады. Комсамолец павінен навучыцца пісаць у сваю газэту, павінен паатрымліваць селькораў, павінен умець завязваць сувязь з рабочымі бліжайшага гораду. Комсамолец павінен стаць лепшым памоцнікам добрага настаўніка й настаўніцы, якія шчыра хочуць дапамагчы вёсцы. Комсамолец павінен умець працаваць над сабой у першую чаргу. Больш усяго ня любіў т. Ленін тых, якія зазнаюцца. Ен сказаў, што комсамолец не павінен гаварыць модныя словы, зусім не разумеючы іх сэнсу. Комсамолец павінен вучыцца і вучыцца. Начаўшы з азбукі, стаўшы політычна граматным, комсамолец павінен узяцца за вывучэньне галоўных кніжак Леніна.

Комсамолец вёскі павінен зразумець, што перад ім нераспачаты край працы.

Уся наша партыя—партыя т. Леніна—узяла сваім галоўным лёзунгам: бліжэй к вёсцы! Пар[тыя] ведае, што шмат годоў пр[] трэба дзеля таго, каб цяпераш[нюю] вёску зрабіць сапраўдна[] нінскаю.

У вёсцы начынаюць падні[маць] голаў кулакі. Іх сыны спробуюць забраць у свае [рукі] вясковую моладзь. Бацька [] справу грашыма, а сынок—го[] і нахальствам. Комсамольцы [вя]скі павінны дапамагчы нам [ар]ганізоваць наперад за ўсе бе[дняц]кую і серадняцкую моладзь, [] цягнуць да нашай орган[ізацыі] вясковых батракоў і так[им] [] паставіць кулакоў перад сьц[] бедняцкага й серадняцкага [] наньня. Хто палеза супроць [] кай сьцяны—разаб'е сабе [].

Савецкая ўлада, верная [за]ветам Леніна, дае ма[г]масьць працоўнай мо[ладзі] вучыцца.

Яна робіць і зробіць ус[ё] [ма]чымае, каб дапамагчы [] частцы вясковай моладзі [] маць асьвету й выкаваць з [] сапраўдных працаўнікоў [] скай рабоча-сялянскай [] Але вучыцца трэба ня то[лькі] сьценах вучэбных устано[ў] ў жыцьці, у барацьбе, на[] тыцы, пачынаючы з сама[] ленькага, да важнага дзел[а].

3600 экз.

Ўліт № 6471

Па комсамольскіх весках.



Моладзь за працай.

Як мы організаваліс.

(Вольбіраўская яч. ЛКСМБ).

Летась нас сабралася каля дзесяці хлопцаў і пачалі мы гутарыць як організавацца, чыталі мы газэты хадзілі на сходы ладзілі спэктаклі.

Пачнуць чырвоназармейцы гутарыць аб комсамоле дык і нам паслухаўшы як працуюць комсамольцы, хочацца стаць комсамольцамі.

Пашлі гэта мы тапгацца. Прышлі у ваенную ячэйку просім каб нас організавалі і дапамаглі працаваць.

Дык адны кажуць „добра паможам“ а другія раілі, што трэба пачакаць

Прышлі ў рэшце да свае настаўніцы, якая дапамагла нам паехаўшы ў раён адкуль нам выслалі організатара.

Запісалася нас 40 чалавек—ячэйка вялікая, але шмат з хлопцаў аказаліся дрэннымі мы іх і павыкідалі.

У нашай працы ёсьць перашкоды але стараннай працай мы выжывем іх каб стаць сапраўднымі левінцамі.

Юнкор.



Вось так аграном!

(Сав. гасп. Чыжэвічы, Адкулаўскай групы).

На павестцы дню однаго агульнага сходу працоўнікоў сав. гасп. разглядаўся, зьмешчаны ў газеце «Мал. Араты» артыкул, які падкрэслівае, адну з балючых струнак нашай сав. гасп. Вось, што сказаў па гэтаму пытаньню кіраўнічы сав.-гасп., ён-жа і аграном—Бусько:

«Ды навошта гэту гразь сав.-гасп. раскавырваць. Няхай-бы яна і сядзела ў сваіх берагох. Або ці-ж гэта толькі ў вас яе многа, ды па іншых сав.-гасп. ёсьць гразі яшчэ больш, однак яны пра яе ў газэту ня пішуць, о толькі наша сав.-гасп. пастаралася першай показаць сябе».

Вось—так аграном!

Таварышы Аграномы!

Дакажэцэ нашаму аграному—Буську, што гразкое балота ні дае ніякай продукцыйнасьці і што сав. Улада зробіць вялікае дасягненьне, калі па ўсёй Беларусі правядзе меліорацыю на ўсе 100 процантаў

Профупаўнаважаны.

Да шматпольля.

(Пухавіцкі р., Менскай акр.).

У нашу вёску Машчонае аднаго разу заглянуў аграном. Адразу ён павёў гутаркі з сялянамі наконт сельска-гаспадарчых палепшэньняў.

Даў зразумець сялянам што такое «празпалосіца» і што такое шматпольле.

Усе сяляне ў каторых шнурок, палоска, сажань ці 2 сажні шырыні адразу згадзіліся з аграномам, што трэба заводзіць шматпольле.

Характэрна, што з усіх сялян нязгодзіліся толькі 2 гаспадары. Рэшта зьвякавалі аграноме і прасілі каб часьцей наяжджаў гутарыць з імі па пытаньнях—«як палепшыць гаспадарку».

Ул. Браягоўка.



Яшчэ афяра кулацкага разгулу.

На днях атрымана тэлеграма, аб тым, што забіты сэкратар комсамольскай ячэйкі, старшыня камітэту узаемнай дапамогі вёскі Мокрае, Быхоўскага раёну, Магілеўскай акругі—**БАРАНКЕВІЧ ПЕТРА.**

Падрабязгова аб забойстве будзе паведамлена асобна.

Дурныя прыклады.

(Пугляеўскі с-с Аршанская акруга).

У студзені месяцы ячэйка ЛКСМБ наладзіла спэктакль, пасьля чаго пачаліся скокі.

Як нябрыдка але трэба прызнацца, што ініцыятарамі скокаў зьяўляліся нашы комсамольцы Пугляеўскай ячэйкі.

Адчыніў скокі сэкратарь Пугляеўскай яч. КПБ т. Мачульскі, за ім комсамолец кулак сын старшыні Івашкевіч які па французкі кіраваў скокамі. Далей ідзе чарга комсамольцаў і кандыдатаў КП(б)Б. Піліовічы М. і Т. Кадзіт, А. Загарэльскі, Т. Загарэльскі і Касьцюкоў.

* * *

Коханаўскі раён.

Таксама ў студзні м-цы культасьветны гурток ставіў спэктаклі ў школе.

Пасьля спэктаклю як водзіцца... скокі. Але па дарозе зайшлі інструктары Акружкому якія тлумачылі да чаго даводзяць скокі. Частка пьяных кулакоў на чале з комсамольцам — студэнтам з Масквы — Буштынавым пачалі крычаць і запатрабавалі скокі, якіх і дамагліся.

Можа-б „М. А.“ давёў да ведама Маскоўскую ячэйку тэхнічнага інстытуту дзе ён вучыцца і па яго славам пераходзіць у РКП(б). Ен сын заможнага селяніна Аршанскай акр. Капыскага р. Старасельскага с.-с.

Клютко-Дубовік.



АДСТАЛІ.

(Чырвона-Слабодзкая 7-хгодка—Случчына).

Нашая Чырвона-Слабодзкая сямігодка ў вучэньні адстала. Адстала яна па многім прычынам: 1) Што ў нашай сямідце заняткі пачаліся позна, прыблізна 1-га кастрычніка, за тым, што будынак нашае школы быў заняты РИК ам, а будынак РИК'а тады быў у рамонце. 2) Што з пачатку вучэбнага году вяліся кепскія заняткі, ня было доўга расклада лекцыяў. 3) Было недахват настаўнікаў, да і із тых, якія былі, некаторыя пакінулі, як напрыклад адна настаўніца узяўшы водпуск на 6 тыдняў не хадзіла на заняткі. А другі настаўнік паехаў у Менск вучыцца, а на места яго другога доўга ня прысылалі. Но ня гледзячы на гэткія дрэнныя ўмовы, мы пачалі працаваць у вячэрніх гуртках, каб падагнаць усё тое, ў чым адсталі. Праца ў гуртках адзначаецца вельмі добра. Працуючы колектыўна мы можам карыстацца малым лікам кніг. А ў нас большасьць вучняў ня можа мець, паасобку ўсе падручнікі.

Янка Бань.

Німа парадку нідзе.

(м. Халопенічы, Барысаў-скай акругі).

У Халопеніцкім Народным доме заўсёды, калі ні зайдзеш шум ды гам. Калі атрымаюцца газэты, дык іх ня можна пачытаць: надта шум ўжо бальшы. А хто ў гэтым віновен? У Народны дом ходзяць гэткія алямэнты, якія прыходзяць толькі каб паштурхацца, пагутарыць, а каб пачытаць газэтку дык гэта не. Стораж Нардому крычыць, выганяе, але нічога ні памагае.

Возьмем другі прыклад—тэатр: 10 студзеня (гэтага году) дзеці жыдоўскай школы, ставілі спэктакль. І вось ў працягу пастаноўкі п'есы чуць ня ўсе лавы былі паломаны.

Памойму трэба было-б выбраць праўленьня Нардому, якое сачыла б за парадкам ў Нардоме і тэатры.

Вока.



Кулакі зарабляюць.

(в. Машчанае, Пухавіцкі р.).

Недалёка ад нашае вёскі ў 18-м разьезьдзе грузяць дровы. Беднейшыя сяляне накіроўваецца туды, каб што небудзь падрабіць дык ніколі машынцы на чыгунцы ня зловяць

Кулакам дык неяк удаецца. Напрыклад, Кулаку Ліходзіеўскаму Ен возьме фунтаў 3—4 сала хлеба ды і ў заработкі. Сам мае 17 дзесяцін зямлі (18 дзесяцін сенокосу ў яго забралі ў мінулым годзе).

Мне здаецца, што гэтакім „беднякам“ заработкі непатрэбны

Корэсподэнт.

ТАНЦУЛЬКІ.

(Каменская яч., Узьдзенскі р.)

У нашай ячэйцы ёсьць чалавек 8, якія дзяруць падэшвы выбрыкваючы паскудныя скокі.

Як пачнуць гарцаваць часамі дык толькі і чуваць:

«Вальс са сваімі» «Каломна» і інш.

Надзея Пушкарчук жыцьцё за скокі адпаць гатова.

Як пачне тупаць аж-шчэпкі ляцяць.

Шкода на вёсцы няма вялікай будыніны дзеб душу адвесьці.

Мо каўпак дасьць спэцыяльнае памяшканьне каб разахвоціліся маладыя душы ды за працу узяліся.

Тутэйшы.

Расьцем і вучымся.

(М. Капыль, Случчына).

Наша ячэйка ЛКСМ была заснована яшчэ ў 1919 г. Шмат працы, гора і радасьці прышлося перанесьці ёй. Акупацыя, бандытызм і інш. усё гэта было пражыта ячэйкай і яна перайшоўшы ўсе «мытарствы», вышла загартаванай, моцнай, сталёвай Ленінскай ячэйкай і цяпер працуе і лічыцца адной із лепшых у нашым раёне. Праца ячэйкай ЛКСМ вядзецца выхаваўчая У ячэйцы налічваецца 53 асобы, якія водлуг іх працы падзелены на дзьве часткі: ячэйку рабочую і ячэйку сялянскую. Рабочая ячэйка налічвае 27 асоб; сялянская—26, з іх 20 хлапцоў і 6 дзяўчат. Кожную суботу адбываюцца сходы рабочай ячэйкі, а ў нядзелю сялянскай. Ставяцца на сходах даклады на розныя тэмы. Сходы ячэйкі адбываюцца адчыненымі, што дазваляе беспартыйнай масе, прыходзіць на сходы, і цікавіцца жыцьцём ячэйкі ЛКСМБ. Сувязь комсамольцаў з беспартыйнымі—здавальняючая. Актывістаў ячэйка, як рабочая, так і сялянская налічвае не асабліва многа. Гэта за тым, што ячэйка вырасла за лік малапісьменных сялянскіх хлапцоў і дзяўчат, якіх трэба яшчэ шмат чаму навучаць, каб выкаваць з іх сталёвымі левінцамі-актывістамі.

Ячейкамі рабочай і сялянскай зьвернута вялікая ўвага на чытку газэт комсамольцамі, на што, на кожным сходзе калі ставіцца індывідуальная справаздача сябра ячэйкі даецца апошнему запытаньне: «Ці чытаеш газэты і якія ці сам выпісваеш і інш. Гэта мае вялікае значэньне для другіх сяброў, і яны па іх магчымасьці, ня толькі чытаюць, але і выпісваюць газэты—шляхам складчыны. Рабочыя комсамольцы выпісваюць газэты на свой кошт на дом. Выдаецца свая комсамольская газэта: «Комсамольская Іскра», якая лічыцца раёнай і якая зьмяшчае корэспондэнцыі з другіх ячэек вясковых. Трэба толькі адзначыць што лік дапісчыкаў у насьценную газэту малы. Тут як заўважаецца таксама зьяўляецца адсутнасьць развітасьці комсамольцаў і яны кажуць «Няма чаго пісаць». Але гэта ў цягам часу зжывецца, бо комсамольцы ходзяць слухаць лекцыі ў вячэрнюю школу, якая зьяўляецца для іх выхавацелем і зьнішчэньнем іх няпісьменнасьці. У школе выкладаюцца ўсе грамадзянскія прадметы, якія толькі патрэбны для разьвіцьця кожнаму сябру-саюзу ЛКСМ. Можна спадзявацца, што праз некаторы тэрмін комсамольцы папоўніўшы свой розумовы багаж, яшчэ шырэй павядуць працу, як у самай ячэйцы, так і за межамі яе.

Я.

Кажух сабе, а гаспадар сябе.

(в. Пліса, Самахвалоўскі р.)

Ул. Чарапок заядлы да вечарынак хлопяц, непайшоў на спэктакль, а пайшоў на танцулькі ў некую хату, Скончыў ён скакаць «жаноарскі» вальц, ды хацеў да хаты йсьці а кажуха няма—пайшоў дзесь гуляць кажух... і пагэты дзень гуляе.

Падумаў Чарапок: «каб пайшоў на спэктакль дык разумнейшым стаў ды і кажух цэлы-б быў».

Комсамолец.



Далоў акупантаў-грабежнікаў.

(Адозва комуністычнай пар-тыі Заходняй Беларусі).

Работнікі і работніцы, сяляне і сялянкі Заходняй Беларусі!

Пяты год стогне наш край. Пяты год нягодныя наезьнікі гвалтуюць, рабуюць, працоўны народ Заходняй Беларусі.

Але ня было больш цяжэйшага году, як апошні Панскія падаткі, як цяжкі камень, прыдушылі нашага селяніна і пагражаюць разбурыць, зьнішчыць яго гаспадарку, а працоўныя масы сялянства давесьці да жабрацтва і голаду.

«Прадай усё, што маеш! Прадай збожжа, увесь свой ураджай, які ты дабыў сваім потам і цяжкаю працаю ў полі».

«Прадай апошнюю карову, каня, увесь свой убогі скарб і заплаці падаткі ў панскую казну»,—вось якую песьню пяе наезьнік панскае Польшчы ў падняволенай Заходняй Беларусі. Што яму з таго, што ўраджай у гэтым годзе быў дрэнны і што селяніну ня хопіць збожжа нават на тое, каб засеяць сваё поле. Ен не глядзіць, што гаспадарка за гады вайны разбурана і занапала,—яму падавай!

З пустое кішэні вясковага працоўніка, ён хоча выціснуць залатыя горы, каб утрымліваць усю гэту шайку дармаедаў і грабежнікаў.

А адкуль-жа наш селянін можа дастаць нават злоты? Бо-ж заработкаў нідзе няма і ўсюды пануе беспрацоўе і зьдзек.

Хіба можа праўда прадаць усе збожжа спэкулянту, а сваіх дзяцей і сямью пасадзіць на мякіну, на галадоўку і вымірарьне.

Хіба можа, праўда, дабраахвотна аддаць сваю карову, каня і ўвесь свой убогі скарб, адрачыся ад свае гаспадаркі і, надзеўшы торбу, ісьці жабраваць, або ў лес, у сьмелы партызанскі атрад і з зброяй у руках, з гневам справядлівым і помстаю ў сэрцы ісьці на паноў, біць іх, паліць іх, катаваць іх.

А падаткі тымчасам сыплюцца і сыплюцца, як град на галаву, дзень аддзень павялічваюцца і канца краю ім ня відаць.

Бяднейшыя сяляне і работнікі, а разам з імі і масы сярэдняга сялянства пераконваюцца ўсё больш і больш, што няма другога выйсьця, як толькі рашучая, бязьлітасная барацьба з акупантамі.

Але як же весьці, як бараніцца ад цёмнае хмары грабежнікаў?

І вось, пачаўся стыхійны байкот падаткаў. Цэлыя вёскі і гміны перасталі плаціць.

— Ня можам плаціць, ня будзем плаціць ня хочам плаціць.

Бо нават каб і хацелі, то няма з чаго. І ў адказ на гэты глухі стыхійны протэст сялянства проціў гвалтаў і грабежніцкае навалы акупантаў—у хату вясковага працаўніка пачалі ўрывацца няпрошаныя госьці, узброеныя з ног да галавы паліцэйскія і зборшчыкі і пачалі апісваць, хватаць, рабаваць, што пападаецца пад руку найбольш каштоўнага; падушкі, палатно, самавары, сякеры, плугі, пілы. З хлява забіраюць апошнюю жывёліну, каб прадаць яе з таргаў. Хватаюць больш сьмелых сялян саджаюць іх у вастрог, б'юць і катуюць.

Здаецца няма канца гвалтам, і сэрца народнае перапаўняецца роспаччу і помстаю.

Таварышы, сяляне і сялянкі Заходняй Беларусі!

Распачатую барацьбу трэба весьці сьмялей. Усё сялянства старыя і малыя, павінны прыняць актыўны ўдзел у барацьбе с ворагам, павінны абараняцца ад гвалтаў.

Байкот падаткаў трэба пашырыць на ўсю Заходнюю Беларусь і ніводнага гроша не плаціць наезьнікам!

Ганьба тым трусам, хто плаціць паном, хто падрывае справу народнае абароны.

А з тымі зраднікамі і спэкулянтамі, што памагаюць паліцыі и наезьнікам, што купляюць аграбаванае народнае дабро з таргоў, што радуюцца і нажываюцца ў народным горы,—з тымі бязьлітасная расправа. Гэтых павукоў народных трэба браць за горла і адвучыць іх ад подлае працы...

А калі паліцыя і зборшчыкі пачнуць ізноў рабаваць вёскі, то трэба хаваць усе найбольш каштоўныя рэчы і жывёлу. Сялянкі няхай хаваюць палатно, збожжа. Лепей хай у зямлі будзе закопана, чымсь каб дасталася нягоднікам. Сяляне павінны хаваць жывёлу ў лесе, у полі, дзе прыдзецца.

Бараніцца трэба ўсімі сіламі. Няпрошаным гасьцям трэба даваць адпор за адпорам... Віламі косамі, цапамі трэба гнаць у карк паліцэйскіх і зборшчыкаў.

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая стала на чале рэвалюцыйнае барацьбы ў нашым краі, заклікае ўсё працоўнае сялянства, усіх работнікаў, сялян і сялянак да адпору грабежнікамі, да гэройскае абароны сваіх інтарэсаў.

Арганізаванасьць, цьвердасьць, упартасьць, дысцыпліна — вось што патрэбна цяпер адбудзіўшымся да рэвалюцыйнае барацьбы сялянам.

Адзін за ўсіх—усе за аднаго!
Прэч грабежніцкія падаткі!
Прэч акупантаў—гвалтаўнікоў Заходняй Беларусі!
Няхай жыве моцны саюз рэвалюцыйных работнікаў і сялян!
Няхай жыве рэвалюцыя!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Вильна, лістапад 1924 г.

Сярод замежнага комсамолу.

Расправа над Швэцкім комсамольцам.

Сэкратар Цэнтральнага камітэту Швэцкага комсамолу прыгавораны на паўгода ў турму за тое што у комсамольскай газэце ён надрукаваў адозву супроць вайны.

Змаганьне нямецкага комсамолу з фашыстамі.

Ня днях у горадзе Потсдаме (нямеччына) адбылася бойка між фашыцкім (чэрнасоценскім) саюзам нямецкай моладзі і комсамолам.

У часы сталкнавеньня ў фашыцкай моладзі комсамольцы адабралі знамя. Паліцыя стварыла арэшты сярод комсамольцаў.

Чаму у гэтым годзе няма зімы

І ці шкодна яна для пасева.

Беларусь у параўнаньні з расіяй і часткай украіны вельмі характэрна адзначаецца цёплай зімой.

Тлумачыцца гэта тым, што Беларусь знаходзіцца бліжэй к Атлантычнаму акіяну. Адкуль дуюць цёплыя вятры, якія ахапляюць сабой Беларусь. Вятры гэтыя цёплыя таму, што праз Атлантычны акіян праходзіць цёплае цячэньне якоя завуць «Гальтром»

Навукай прасочана, што праз кожныя 30 год бываюць цёплыя зімы. Гэты перыод прыблізна падае на гэты год, а ў Беларусі ітак цёплая зіма. Вось чым і тлумачыцца выпаданьне дажджоў замест сьнегу

Гэта нязвычайна цёплая для зімы пагода і адсутнасьць сьнегу непакоіць сялян якія баяцца за свае пасевы.

З одна вестак у нас восеньню недахапала вільгаці для азімых пасеваў і ў некаторых мясцовасьцях яны занапамі, а цяпер як рая і зноў ачунялі дзякуючы добраму надворру.

Гэтакая надворрэ непашкодзіць нават і садам гэта толькі-б тады было-б небяспечным каб ня было сьнегу і доўгі час стаялі трывалыя маразы. Вось тады усё можа вымерзнуць як садавіна гэтак і зімныя пасевы.

Такіх надвораяў у нас быць ня можа бо Беларусь старонка вільготная, багатая на аладзі.



Піонэрскі коопэратыў.

(г. Слуцк).

У Слуцку нядаўна адчыніўся коопэратыў дзяцей і піонэраў.

Маям мы 400 сяброў коопэратыву.

Вялікая дапамога для нас. Мы будзем мець магчымасьць мець добраго сувязь з сялянскімі дзецьмі.

Будзем крэдытаваць іх рассылаючы піонэрскаю літаратуру, газэты і інш. Вучымся весьці працу ад істнуючых рабочых коопэратываў.

Працуем бесграшай. Працаваць з радасьцю паджаюцца усе піонэры загадчык—комсамоляц—аплатны працаўнік Адчыненьне коопэратыву дапаможа нам бліжэй зьвязацца з вёскай. **Вайнэр.**



Паны і парабкі.

(в. Астравок, Смалявіцкі р.).

У в. Астравок ёсьць настаўніца Драздоўская Я. Любіць яна панскае званьне, бо на сходах так і крычыць «Паны ці хутка вашы дзеці прынясуць воўны і лёну? бо мне трэба рукавічкі ды ручнікі рабіць».

У школе у часы заняткаў любіць каб вучні парабкамі былі пасылае іх за пудрай папяросамі запалкамі у коопэратыў.

Хто адмовіцца дык яна круць завушы ды ставіць на калені

Каўпак паведамі належныя органы каб зьвярнулі увагу. Пара ўжо збавіцца ад «паноў».

Астраўскі Уладзя.



Царкауная рада.

(Чырвоная сл., Слуцкай акр.).



Хутка сход царкоўнай рады. (Бучацінскай царквы). Поп паціраэ лапы.

Установіць норму падаткаў на сябе і калі выпадзе, дык на царкву.

«Карыстай час калі дурні трапіліся»—мысьліць поп.

Сход рады начаўся. Вырашылі з усіх падаткаў трэць аддаваць папу, а рэшту (2 трэці) на царкву.

Нясьвеліся грэшныя з «атцом сьвятым» надуўся поп як мыш на крупы.

— Няхочу! Увесь налог мне вяйначай...

За нязгоднасьць бацька распусьціў раду каб склікаць новаго.

Каупак дай яму поля прайы і поўнамаятва каб у твaіх сьценах поп меў права склікаць раду, бо на вёсцы у пустую будзе ўсё.

Я. Пуга.

Папалі не па адресу.

(в. Путчына, Койданаўскі р.)

Пачулі В. Хацкевіч і С. Васілеўскі, што запішацца ў ячэйку ЛКСМ дык будуць за бутэльцы сьпірту даваць і аружжа выдадуць.

Усё-ж сьпірт лепей за самагонку якую самі хлопцы ў лесе гоняць запісаліся ..

Мыляіцися хлопцы, ня туды вы трапілі шмат разоў ячэйка вас папераджала, а цяпер прав каўпак паедзепе з Старынскай ячэйкі, калі весправіцися.

Вачавідзец-сьведка.

Захацеу жаніцца

(Яч. Бальшавік Узьдзенск. р.)



Крысько Янка, комсамолец Быў працавітым хлопцам. Але раптам зьмена, загультаіўся прычына вядомая—закахаўся, захацеў жаніцца

Ня мае свайго разуму хлопец дзяўчына падгаварыла кінуць комсамол.

Комсамольцаў — якія чужым шкодным розумам жывуць нам нятрэба.

Пад каўпак іх. **П. Рон.**

ПОШТА.

ЧЫКУНУ П. Ні таго і ні другога комсамольцу ня можна рабіць, а цікава, што новае напішаш? Чакаем.

ДРЭЙЦАРУ: Твае корэсподэнцыі каштоўныя, шкода, што аб 9-м студзені спазьнілася.

ВАНЬ ЯНКА. Корэсподэнцыя «Гэтак не гадзіцца рабіць». Цікава толькі у насьценную газэту, туды і зьмясьці гэты факт.

КАЛАСКОВУ КУЗЬМУ (Калінінскі окр.) Верш прысьвячены Леніну спазьніўся.

БРАЗГОУКУ і ІЛЬКЕВІЧУ. Корэсподэнтамі залічаем. Аб чым пісаць? —гэта можна сачыць за газэтай.

Пісаць корэсподэнцыі трэба на 1-м боку паперы.

КАРЖЭЛЮ: Корэсподэнцыю перадаем у Наркамасьветы. Верш у «Маладняк» (Усебеларускае аб'еднаньне поэтау і пісьменьнікау). Калі хочаш залічыцца сябром «Маладняку»—падай заяву і некалькі вершау.

КРАСОУСКАМУ: Залічаем корэсподэнтам. Вызавы больш недрукуем.

БЕРДНІКУ: Перадаем у адзел падпіскі, каб вывілі прычыны невысылкі газэты.

ДАБРУШЭВІЧУ: Артыкул спазьніўся,—напойдзе.

Т. ШЫБКО і ШЫКУНУ: Рэдакцыя раіць падаць заяву у аб'яднаньне «Маладняк». „Маладняк" вядзець працу сярод сваіх сяброу, адзіночак, рая як пісаць вершы і дапаможа кіравацца ваусіх літаратурных напрамках. Спыткі творау сваіх сяброу «Маладняк» выдае сам. Верш «Скарга папа»—скарыстаем..

2-я друк.-літ. «БДВ» 3600 экз. Галоўліт № 6471